# НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ТЭАТР ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ ЯК ТЭАТРАЛЬНЫ БРЭНД (да 100-годдзя з дня заснавання)

***Г. М. Стэльмах,***
*кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт,*
*дацэнт кафедры менеджменту сацыяльна-культурнай дзейнасці*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў*

3 верасня 2019 г. распачаў свой 100-ы тэатральны сезон вядучы тэатр краіны – Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы. Створаны ў Мінску ў 1920 г. шляхам зліцця беларускай, рускай і яўрэйскай труп Беларускі дзяржаўны тэатр урачыста адкрыўся шырокай грамадскасці 14 верасня спектаклямі «Рысь» па аповесці Э. Ажэшка, «Вяселле» А. Чэхава і «Людзі» Шалом-Алейхема [6, с. 191].

За гады існавання тэатр неаднаразова пераназываўся, прайшоўшы шлях ад «акадэмічнага»[1] (1921), «Першага» (БДТ-1, 1926), «імя Янкі Купалы» (1944), «Акадэмічнага» (1955), «Нацыянальнага» (1993) [4], аднак заўсёды заставаўся адданым ідэям нацыянальнага культурнага адраджэння, фарміравання нацыянальнай акцёрскай школы. Гэта знайшло ўвасабленне, найперш, у рэпертуары тэатра, аснову якога складалі творы беларускіх пісьменнікаў і драматургаў Ф. Аляхновіча, В. Быкава, Ц. Гартнага, В. Дуніна-Марцінкевіча, К. Каганца, Я. Коласа, К. Крапівы, Я. Купалы, А. Макаёнка, М. Матукоўскага, І. Мележа, Е. Міровіча, К. Чорнага, І. Чыгрынава і інш.

Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы сёння – гэта флагман беларускай драматычнай сцэны, найстарэйшы прафесійны тэатр краіны, які, па слушнаму выказванню мастацкага кіраўніка тэатра М. Пінігіна, «размаўляе з гледачом

[1] Урад надаў малому тэатру званне, каб узняць прэстыж беларускай культуры, але шыльда ўпрыгожвала тэатр нядоўга.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мовай свайго народа, выказвае праз сваю літаратуру думкі і пачуцці нацыі … Каб мары нашых геніяў Купалы, Коласа, Багдановіча аб незалежнай, вольнай, адукаванай Беларусі спраўдзіліся» [2].

Плённая і шматгадовая праца калектыва тэатра дазволіла яму стаць не толькі «галоўнай драматычнай пляцоўкай краіны» [2], але і пераўтварыцца ў сапраўдны брэнд. І для гэтага ў тэатра ёсць усе падставы.

Сучасная тэорыя брэндзінгу (В. Перцыя, Л. Мамлеева, І. Ражкоў, В. Кісмерэшкін) разглядае брэнд «як набор успрыманняў ва ўяўленні спажыўца … адносна прадукту, калі ён бачыць яго лагатып ці чуе назву» [5, с. 26].

Брэнд – гэта атрыбуты, якія ўвасабляюць у свядомасці спажыўца важныя і каштоўныя якасці прадукту, што адлюстроўваюць яго індывідуальнасць і матывуюць да здзяйснення пакупкі. Тэатральны брэнд складаецца, перадусім, «з вядомасці тэатра (у тым ліку за мяжой), пазнавальнасці яго назвы, узнікнення выразных асацыяцый, наўпрост злучаных з яго дзейнасцю, артыстамі, пастаноўкамі, магчымасці скарыстаць яго сімволіку і атрыбуты ў камерцыйных мэтах» [7, с. 55].

Такім чынам, архітэктура тэатральнага брэнда прынамсі уключае наступныя тры атрыбуты – акцёр / рэжысёр, спектакль і тэатр, якія спалучаюцца і дапаўняюць адзін аднаго ў розных рэалізацыях і праяўляюцца, на наш погляд, у Нацыянальным акадэмічным тэатры імя Янкі Купалы.

Артысты Купалаўскага тэатра – россып таленавітых і ўнікальных асоб, што складаюць касцяк айчыннай акцёрскай школы. Стэфанія Станюта, Ірына Ждановіч, Барыс Платонаў, Вера Пола, Лідзія Ржэцкая, Уладзімір Дзядзюшка – піянеры-«купалаўцы», якія пачыналі творчы шлях тэатра. Галіна Макарава, Зінаіда Браварская, Здзіслаў Стома, Павел Кармунін, Мікалай Яроменка, Лілія Давідовіч садзейнічалі ўсеагульнай славе тэатра ў савецкія часы. Генадзь Гарбук, Генадзь

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Аўсяннікаў, Віктар Манаеў, Марыя Захарэвіч, Аляксандр Падабед, Ігар Дзянісаў працягвалі прывабліваць гледача ў тэатр і ў перыяд станаўлення беларускай суверэннай дзяржавы. Святлана Анікей, Раман Падаляка, Міхаіл Зуй, Павел Харланчук-Южакоў, Юлія Шпілеўская, Аляксандр Казела – артысты малодшага пакалення, якім яшчэ толькі мае быць упісаць свае імёны ў славутую гісторыю тэатра[2].

Не памылімся, калі скажам, што самай вядомай актрысай Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы з'яўляецца Стэфанія Міхайлаўна Станюта, амаль 70 гадоў жыцця якой было аддадзена купалаўскім падмосткам. Простыя гераіні з народа [Алена – «Салавей» З. Бядулі (1937), Паланея – «Прымакі» Я. Купалы (1944), Марыля – «Раскіданае гняздо» Я. Купалы (1972)] у яе выкананні выяўлялі душэўную шчодрасць, мудрасць, жыццяздольнасць. Вострая сатырычнасць характараў гранічыла з паглыбленым псіхалагізмам. Не выпадкова С. М. Станюту называлі самай народнай артысткай і талісманам Купалаўскага тэатра [1]. І яна сама больш за ўсё на свеце любіла тэатр і была адданая яму ўсё жыццё. Стэфаніі Міхайлаўне было ўжо за 90 гадоў, а яна па-ранейшаму выходзіла на сцэну, і за сваё творчае даўгалецце сыграла ў шматлікай колькасці спектакляў. Але ў асноўным гэта былі невялія ролі, эпізоды. Пры гэтым усенародная любоў, слава і прызнанне прыйшлі да С. М. Станюты, калі ёй было ўжо 70 гадоў, і да гэтага яна ставілася вельмі спакойна. І на захопленыя воклічы прыхільнікаў: «Вы – святая, вы – абраз!» – казала: «А дзе вы раней былі... І, наогул, іконы, яны толькі ў царкве» [1].

Знакавыя рэжысёры Купалаўскага тэатра Еўсцігней Міровіч [«На Купалле» М. Чарота (1921), «Машэка»

[2] Нельга не адзначыць, што за гады існавання Купалаўскага тэатра склаліся акцёрскія дынастыі Белахвосцік [яе заснавальнікам быў акцёр Глеб Глебаў, а прадаўжальнікамі сталі сын Валянцін Белахвосцік, унучка Зоя Белахвосцік (усе трое – народныя артысты БССР і Беларусі) і праўнучка Валянціна Гарцуева] і Уладамірскія (Уладзімір Уладамірскі, яго сын Барыс і ўнук Аляксандр).



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Е. Міровіч (1923), «Кастусь Каліноўскі» Е. Міровіч (1923)], Леў Літвінаў [«Бацькаўшчына» К. Чорнага (1933), «Паўлінка» Я. Купалы (1944), «Гэта было ў Мінску» А. Кучара (1949)], Канстанцін Саннікаў [«Канстанцін Заслонаў» А. Маўзона (1947, Дзяржаўная прэмія СССР – 1948), «Пяюць жаваранкі» К. Крапівы (1950, Дзяржаўная прэмія СССР – 1952), «Выбачайце, калі ласка!» А. Макаёнка (1954)], Барыс Эрын («Людзі на балоце» І. Мележа, «На дне» М. Горкага, «Памінальная малітва» Р. Горына паводле Шалом-Алейхема), Барыс Луцэнка [Раскіданае гняздо» Я. Купалы (1972, аднаўленне – 1982)], Валерый Раеўскі [«Радавыя» А. Дударава (1984, Дзяржаўная прэмія СССР – 1985), «Мудрамер» А. Матукоўскага (1987, Дзяржаўная прэмія Беларусі 1988), «Страсці па Аўдзею» У. Бутрамеева (1989)] вялі штодзённую і карпатлівую работу па пошуку новых пастановачных прыёмаў і выяўленчых сродкаў выразнасці спектакляў.

Паслядоўную і планамерную працу ў гэтым кірунку праводзіць і цяперашні мастацкі кіраўнік тэатра М. Пінігін. Распачатыя яшчэ ў 1990-х гг. у такіх гучных спектаклях, як «Тутэйшыя» Я. Купалы (1990, Дзяржаўная прэмія Беларусі – 1992)[3] і «Ідылія» В. Дуніна-Марцінкевіча (1993), эксперыменты з формай і мастацкімі прыёмамі рэжысёр працягвае і ў 2000-я гг. у спектаклях «Чайка» А. Чэхава (2015), «Талерантнасць» Я. Рэза (2018), «Рэвізор» М. Гогаля (2018).

І як шырока вядома, спектаклем візітнай карткай тэатра з'яўляецца пастаноўка Л. Літвінава «Паўлінка» па п'есе Я. Купалы, якая не адно дзесяцігоддзе адкрывае тэатральны

[3] Адзначым, што і на сённяшні момант спектакль «Тутэйшыя» з'яўляецца лепшым, на наш погляг, і ў біяграфіі рэжысёра, і ў гісторыі Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы. Як справядліва адзначаў М. Пінігін у розных інтэрв'ю: «Купала вельмі дакладна сфармуляваў сітуацыю ў Беларусі. Гэта край, які будзе бясконца то Усходам, то Захадам … Купала стварыў геніяльны псіхалагічны тып беларуса. Канфармізм – вельмі тыповая рыса беларуса: прыстасавацца, каб выжыць. Гэта вынік жыцця "на скрыжаванні"» [3]. І гэта тое галоўнае, што робіць п'есу «Тутэйшыя» актуальнай ва ўсе часы, а сцэнічную версію М. Пінігіна 1990-га г. – культавым сімвалам новай эпохі.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сезон Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы (выключэнне было зроблена ў 2018 г. для прэм’ернага паказу спектакля «Сон у купальскую ноч» рэжысёра А. Прыкатэнка па п’есе У. Шэкспіра «Сон у летнюю ноч»).

Унікальнасць спектакля не толькі ў тым, што ў «сцэнах са шляхоцкага жыцця» (паводле першапачатковага вызначэння) раскрыты каларытныя вобразы беларусаў, але і таму, што спектакль стаў «школай» не для аднаго пакалення акцёраў. Свой творчы шлях у тэатры Зоя Белахвосцік пачала менавіта з ролі Паўлінкі і ігрАла яе цягам 18 гадоў. Генадзь Гарбук у розныя часы іграў у спектаклі Сцяпана Крыніцкага, Пранцыся Пустарэвіча, Якіма. Больш за 1000 разоў у ролі пана Быкоўскага выходзіў на сцэну Арнольд Памазан.

Такім чынам, спектакль «Паўлінка» Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы выступае так званым парасонавым брэндам, што аб’ядноўвае пад сваім імем выканальніцкае майстэрства пэўных артыстаў і дзейнасць тэатра. Між іншым, філасофія тэатра, яго гісторыя і пошукі новых фармаў працы і шляхоў стасункаў з гледачом выступаюць кутным камянём пры фарміраванні і ўсталяванні брэнда тэатра. Калі зыходзіць з класіфікацыі брэндаў з пункту гледжання спажывецка-брендзінгавых зносін, то сёння Купалаўскі тэатр імкнецца да «брэнда натхнёнага, юнага, сучаснага, энергічнага» [7, с. 57].

Статус галоўнай драматычнай пляцоўкі краіны дазволіў Нацыянальнаму акадэмічнаму тэатру імя Янкі Купалы атрымаць лепшае абсталяванне сцэны пасля рэканструкцыі ў 2013 г. (а заадно і вярнуць будынку яго першапачатковае аблічча). У выніку з’явіліся такія складаныя з тэхнічнага пункту гледжання (мультымедыйна насычаныя) пастаноўкі, як, напрыклад, спектакль «Сон у купальскую ноч». Малая сцэна тэатра была аддадзена «купалаўскаму маладняку», які праводзіць чыткі і ставіць спектаклі, што выклікаюць у гледача сапраўднае захапленне [«Радзіва “Прудок”» А. Горвата



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

(2018)]. Апроч таго, і з фармальнага пункту гледжання тэатр валодае прыкметамі брэнда: вядомая назва, пазнаваемая колеравая гама лагатыпа, дызайн паліграфіі, уніформа супрацоўнікаў, а самае галоўнае – устояная рэпутацыя, што вылучаюць яго сярод драматычных тэатраў краіны.

Такім чынам, сучасная дзейнасць Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы – гэта не толькі адказ на зменлівыя патрэбы спажыўцоў і жаданне пашырыць глядацкую аўдыторыю. У канчатковым выніку гэта «запатрабаванасць брэнда», якая дазваляе тэатру выканаць «адбудоўку» ад канкурэнтаў. Калі ў гледача паўстае жаданне зноў наведацца ў Купалаўскі тэатр на канкрэтны спектакль і ён прыходзіць, значыць, тэатр ці спектакль менавіта для гэтага гледача з’яўляецца яго своеасаблівым брэндам.

---


1. *Езерская, Э.* Стефания Станюта. Легенда белорусской сцены, которая плакала прямо в кинозале, увидев себя некрасивой на экране [Электронный ресурс] / Э. Езерская // СТВ. – Режим доступа: http://www.ctv.by/stefaniya-stanyuta-legenda-belorusskoy-sceny-kotoraya-plakala-pryamo-v-kinozale-uvidev-sebya. – Дата доступа: 08.09.2019.

2. Купалаўскі тэатр [Электронны рэсурс] // Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы. – Рэжым доступу: http://kupalauski.by/. – Дата доступу: 07.09.2019.

3. *Марціновіч, Дз.* 1990: Адбываецца прэм’ера спектакля «Тутэйшыя» [Электронны рэсурс] / Дз. Марціновіч // 90s.by. – Рэжым доступу: http://90s.by/years/1990/tutejshyja.html. – Дата доступу: 08.10.2019.

4. Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы / уклад. М. Бартніцкая, А. Калюнова, К. Мізгайла. – Мінск, 2000. – 70 с.

5. *Рожков, И. Я.* Брендинг / И. Я. Рожков, В. Г. Кисмерешкин. – М. : Юрайт, 2015. – 331 с.

6. Тэатральная Беларусь : энцыклапедыя : у 2 т. / пад агульн. рэд. А. В. Сабалеўскага. – Мінск : Беларус. Энцыкл., 2002–2003. – Т. 2 : Лабанок – Яшчур / Г. П. Пашкоў [і інш.]. – 2003. – С. 191–204.

7. *Урядова, А. В.* Первый русский театр: от названия к бренду / А. В. Урядова // Альманах теоретических и прикладных исследований рекламы. – 2014. – № 2. – С. 51–69.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ